# Белакрылы капманьён і сучасныя выклікі прыродзе

Бусел пасябраваў з нашымі продкамі ў старажытныя часы, калі заўважыў, што яму лягчэй пракарміцца на абшарах паблізу чалавечага жылля, таму і сяліцца стаў побач. Чалавеку гэта спадабалася: руплівыя буслы знішчалі на яго зямлі шкоднікаў. З таго часу яны так і жылі непадалёк: чалавек і бусел. Прыгожая добразычлівая птушка стала ўпадабанай гераіняй фальклору. Ёсць нават меркаванне, што яе густоўнае аблічча натхніла ў свой час стваральнікаў беларускага арнаменту, якія выкарысталі менавіта спалучэнне белага, чорнага і чырвонага колераў.

Аднак у апошнія стагоддзі белакрыламу кампаньёну ўсё цяжэй стала прыстасоўвацца да ладу і рытму жыцця свайго даўняга суседа. Буйны рост прамысловасці, інтэнсіфікацыя сельскай гаспадаркі, урбанізацыя, іншымі словамі, тэхнагенныя ўздзеянні, унеслі значныя, часцей негатыўныя карэктывы ў традыцыйны парадак жыцця гэтай птушкі. Дастаткова сказаць, што ў Заходняй Еўропе, напрыклад, ізаляваныя папуляцыі белага бусла напрацягу многіх гадоў скарачаліся і ў другой палове XX стагоддзя знаходзіліся на мяжы поўнага знікнення. У нулявых сітуацыя значна выправілася, але ў апошнія некалькі гадоў з-за кліматычных змен і няспыннага пагаршэння натуральных месцапражыванняў колькасць буслоў зноў пачала памяншацца.

Наогул, у свеце іх налічваецца больш за 250 тысяч пар, прыкладна кожная дзясятая з якіх выводзіць птушанят у Беларусь Па колькасці гняздуючых буслоў наша краіна ўступае толькі Іспаніі, Украіне і Польшчы, плошча якіх значна большая. Аднак тэндэнцыі, што фатальна адбіліся калісьці на заходнееўрапейскай папуляцыі, непазбежна развіваюцца і ў нас. Працэс гэты неабходна адсочваць і кантраляваць, каб своечасова дапамагчы свайму старадаўняму сябру прыстасавацца да новай, больш агрэсіўнай для яго рэчаіснасці. Вывучэннем стану і праблем папуляцыі белых буслоў у Беларусі займаецца лабараторыя арніталогіі Навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах НАН Беларусі.

- Умовы пражывання белага бусла на розных участках гнездавога арэала, у тым ліку і на тэрыторыі нашай краіны, істотна адрозніваюцца, - гаворыць загадчыца лабараторыі кандыдат біялагічных навук Ірына Самусенка. - Пастаяннае назіранне за колъкасцю і поспехам размнажэння буслоў можа шмат расказаць пра стан навакольнага асяроддзя і дазволіць аператыўна рэагаваць на негатыўныя змены экалагічных абставін.

З гэтай мэтай з 1934 г. дзейнічае адна са старэйшых міжнародных праграм арніталагічнага маніторынгу - Міжнародныя ўлікі колькасці белых буслоў, што арганізоўваюцца кожныя 10 гадоў. Наша краіна прымае ў іх удзел з канца 1950-х. Апошні раз гэта мерапрыемства прайшло ў 2014-2015 гг. Паводле яго вынікаў супрацоўнікамі лабараторыі была зроблена карта, якая адлюстроўвае рассяленне буслоў у межах краіны.

- Нераўнамернае размеркаванне буслоў на Беларусі растлумачыць проста, - каменціруе Ірына Самусенка. - Больш за ўсё іх гняздуецца на вільготных тэрыторыях, напрыклад у далінах рэк, асабліва - у пойме Прыпяці, што раней разлівалася ўвесну на некалькі дзясяткаў кіламетраў. У прыватнасці, самая вялікая колъкасцъ буслоў - каля 800 гняздуючых пар - жывеў Пінскім раёне. Але нават у прырэчных рэгіёнах сітуацыя змяняецца: у мясцінах на вялікай адлегласці ад гарадской цывілізацыі колъкасцъ буслоў паступова зніжаецца, бо маладзейшыя вяскоўцы паступова ад’язджаюцъ, старыя дажываюцъ, тому зямля горш абрабляецца, менш становіцца хатняй жывёлы, сенакосаў. Кармоў для бусла на былых поймавых сенажацях дагэтулъ хапае, але ў высокой траве яму цяжка знайсці і злавіць здабычу. Восъ і перасяляюцца белакрылыя птушкі ў іншыя рэгіёны. І не яны адны.

Беларусь заўсёды лічылася птушыным раем, бо тут вялікая прыродная разнастайнасць, розныя біятопы. Ёсць падобнасць стэпаў і нават выдма на поўдні краіны. Таму ў нас адчуваюць сябе ўтульна многія, у тым ліку рэдкія віды птушак. Але чалавек парушыў іх традыцыйныя месцы пражывання, і яны вымушаны перабірацца часам у нязвычнае для сябе асяроддзе, як тыя ж буслы.

Дачка біёлага, Ірына Самусенка дапамагала бацьку яшчэ падчас адных з першых у нашай краіне ўлікаў буслоў і памятае, як з адной кропкі на ўзвышшы было бачна 20-30 гнёзд. З якой цікавасцю яна назірала за ўзаемаадносінамі і звычкамі птушак. Зараз на тым месцы ў пойме Прыпяці закінутая тэрыторыя, а птушкі перасяліліся следам за людзьмі, у тым ліку ў населения пункты, у пошуках больш лёгкага жыцця. Але на новых месцах яны часам сутыкаюцца з небяспекай, да якой не гатовы. Шмат птушак, у прыватнасці, гіне на дарогах пад коламі машын. Але галоўная праблема ў тым, што сучасныя буслы абралі ў якасці падмурка для сваіх гнёзд апоры ліній электраперадачы. Больш за палову птушак сёння селяцца ў гэтых небяспечных месцах і ўсё менш выбіраюць для буслянкі традыцыйныя вясковы дах або дрэва.

- Птушкі калечацца і гінуць ад высокага напружання, адудараў аб правады, у выніку кароткага замыкання, - расказвае Ірына Самусенка. - Часам гнёзды вымушаны скідаць энергетыкі, каб папярэдзіць аварыйныя сітуацыі ў сістэме падачы электраэнергіі. Яны ж, дарэчы, і прыдумалі, як дапамагчы буслам. Па прыкладзе пінскіх калег у Івацэвіцкім, Мастоўскім, Браслаўскім, Маларыцкім і іншых раёнах мясцовыя энергетыкі пачалі манціраваць на слупах ЛЭП спецыяльныя платформы для буслянак на 1-1,5 метра вышэй правадоў. І хаця колькасць такіх платформ для краіны пакуль адносна невялікая, подобная практика з’яўляецца добрым прыкладам вырашэння проблемы. Трэба дадаць, што і такія абсталяваныя месцы патрабуюць дагляду з боку чалавека: праз 2-3 гады вяршыню гнязда трэба здымаць, каб вялікая буслянка не замінала дзейнасці электраліні. Напэўна, менавіта гэта перашкаджае афіцыйнаму признанию такой практикі па ўсёй краіне. Разам з тым пабудова штучнай буслянкі з перыядычнай яе рэканструкцыяй (аблягчэннем) выглядае значна таннейшай справай, чым постоянное разбурэнне існуючых на слупах ці нанова пабудаваных гнёзд.

Тым, хто жадае дапамагчы беламу буслу, адрасаваны і адукацыйныя праграмы лабараторыі, дзе арнітолагі падрабязна расказваюць, як зрабіць зручнае месца для буслінага гнязда на даху, слупе, дрэве. Старадаўняе суседства прывучыла людзей успрымаць бусла як блізкую істоту, што мае патрэбу ў апецы. Такія цесныя стасункі нараджаюць шмат гісторый і легенд, якія арнітолагі выслухоўваюць ад мясцовых жыхароў падчас экспедыцый. Вяскоўцы часцяком лічаць буслоў, што жывуць побач, ці то ні членамі сям’і, назіраюць за іх звычкамі і стасункамі, хваляцца «сваімі» птушкамі перад суседзямі.

Адну з гісторый расказалі мінчане, што выхадныя звычайна праводзяць ў прыгараднай вёсцы і сёлета назіралі за такім сюжэтам. Неяк бацька буслінай сям’і не вярнуўся ў гняздо: відаць, здарылася бяда. Некалькі дзён самачка стаяла ў гняздзе, углядаючыся ў неба і слухаючы галоднае шчоўканне буслянят. Схуднела ўшчэнт, бо не магла пакінуць малых, каб злятаць за ежай, схуднелі і тыя. Раптам у гняздо прыляцеў малады бусел, нешта яны там пашчоўкалі дзюбамі і ён паляцеў кудысці. «Мо да бацькоў, параіцца», - з надзеяй разважалі тутэйшыя. А гараджане ледзь перажылі працоўны тыдзень і на чарговыя выхадныя з цяжкім сэрцам паехалі ў вёску. А там усё добра: у асірацелае гняздо вярнуўся той самы малады бусел, мітусіцца, прыносіць здабычу. «Відаць, бацькі дазволілі сысціся з удавой», - радаваліся ўсе.

- За стагоддзі суседства людзі прызвычаіліся «ачалавечваць» буслоў. А ў жыцці птушак усё больш мэтазгодна адбываецца, - тлумачыць Ірына Самусенка. - У канцы XX - пачаткуXXI cm. у нас назіраўся ўстойлівы рост колькасці буслоў. Яны становяцца палаваспелымі ў 3-4 гады, прылятаюць на гнездование ў родныя месцы і пачынаюць будавацца самастойна, звычайна - не далей за

некалькі дзясяткаў кіламетраў ад бацькоўскага гнязда.

Спачатку могуць праінспектаваць і яго, але калі бацькі жывыя, яны паступяцъ паеўрапейску: маўляў, пасталеў - вырашай свае праблемы сам. Бывав, моладзъ спрабуе адваявацъ бацькоўскае гняздо, але больш вопытная пара здольная за сябе пастаяцъ. Тады «нахабныя патомкі» селяцца непадалёк або далучаюцца да адзінокай суседкі, якудадзеным выпадку. Такім чынамутвараюцца бусліныя калоніі, у межах якіх птушкі маюць зносіны з дапамогай клёкату, якому дапамагаюць разнастайныя позы. Прынамсі, пачуццё прыязнасці, трывогі ці голаду яны здольны перадацъ адзгн аднаму. Нават чалавечую гамонку ў пэўнай ступені разумеюцъ, добра ведаюцъ гаспадароў сядзіб, побач з якімі жывуць. Дарэчы, самая вялікая ў краіне колькасць буслоў заўважанаў вёсцы Малішава Жыткавіцкага равна, акурат на мяжы Брэсцкай і Гомельский абласцей. У адносна невялікай палескай вёсцы на плошчы каля 1 км2 штогод гняздзіцца ад 30 да 50 пар.

Зявіліся свае буслы нават у Мінску. Тут, у прыватнасці, апошнія гадоў сем у раёне Мінскага заапарка прызвычаіліся зімаваць некалькі птушак. Стаяць у Свіслачы ў 30-градусны мароз, шукаюць малюскаў ці дробную рыбінку на мелкаводдзі, або пераляцяць і падсілкуюцца ў качак, якія адкрыта ўтрымліваюцца ў заапарку. Пакуль тэта выпадкі адзінкавыя, бо без дапамогі людзей буслам у нашых широтах у вялікім горадзе не пражыць.

- Тры гады шаму мы пачалі вывучацъ цікавы аспект паводзін буслоў у гарадскіх ўмовах, - расказвае Ірына Самусенка. - У Іспаніі і Партугаліі ўтварылася аселая папуляцыя буслоў, якая не адлятае ў Афрыку, а застаецца на зімоўку. У Іспаніі такіх птушак ужо больш за палову папуляцыі. Гэта звязяна з пацяпленнем клімату і наяўнасцю гарадскіх сметнікаў, дзе птушкі могуць харчавацца круглы год. І такіх буслоў становіцца ўсё больш. Польскія калегі прапанавалі праверыць, ці характерная такая з'ява для нашых прыродных умоў. Мы пачалі назіраць за бусламі. Я была ўпэўнена, штоў нас буслоў на сметніках хіба што адзінкі. Але аказалася, што ў перыяд гнездавання з красавца па жнівень толькі мінскія сметнікі наведваюць да 40 асобін.

На пінскім сметніку з канца чэрвеня да паловы жніўня каля 200 буслоў харчуецца пастаянна, на гродзенскім - больш за 400. Шукаюць яны там мяса, што не даядае чалавек, рэшткі каўбасы, іншыя аб'едкі, якіх у сувязі з ростам добрабыту людзі выкідаюць усё больш. У Польшчы гэтая з'ява ўзнікла ў 1990-я гг.

У нас - у апошняе дзесяцігоддзе.

Такім чынам, як бы там ні было, старадаўнія сябры па-ранейшаму жывуць побач. Нават прыносяць карысць адзін аднаму, і не толькі ў сферы матэрыяльных інтарэсаў. За стагоддзі пражывання ў блізкім суседстве ў чалавека і бусла сфарміравалася падобная сістэма духоўных каштоўнасцей. А некаторым узорам паводзінаў высакародных птушак можна нават павучыцца.

- Буслы - выдатныя сем'яніны, - дзеліцца ўражаннямі Ірына Самусенка. - Прыемна назіраць, як самец і самка чысцяць адзін аднаму перё, як кранальна ставяцца да свайго патомства: крыламі закрываюць гадаванцаў ад сонца, пояць вадой і разам з тым умеюць своечасова адпусціць ад сябе, калі тыя стануць на ногі. Дарэчы, ужо першую сваю восеньскую вандроўку на поўдзень юны бусел робіць самастойна. Маршрут і неабходныя навыкі для гэтага засвоены, відаць, на генетычнымузроўні. І гэта не адзіная загадка бусла, якую чалавеку яшчэ трэба разгадаць.

А яшчэ нам варта паклапаціцца аб бяспецы і камфорце свайго старадаўняга кампаньёна, выму-шанага цярпець ад дасягненняў цывілізацыі.

Кацярына АГЕЕВА

**Источник:** Наука и инновации. – 2019. – № 8. – С. 70 –74.